БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС



Рыта МІШЫНА

# Барацьба славянскіх народаў за нацыянальную незалежнасць

*IX клас*

*Дадзеная тэма школьнага курса гісторыі змяшчае матэрыял, які вывучаўся ў папярэдніх параграфах. Таму настаўніку варта актуалізаваць раней атрыманыя веды вучняў, паказаць залежнасць славянскіх народаў ад знешняй палітыкі еўрапейскіх дзяржаў і высветліць, чаму славянскія народы змагаліся за сваю незалежнасць.*

**Адукацыйныя мэты ўрока:** у выніку вывучэння тэмы вучні павінны прасачыць узаемасувязь адраджэння славянскіх нацыянальных культур і ўздыму барацьбы славянскіх народаў за нацыянальную незалежнасць; навучыцца характарызаваць становішча славянскіх народаў пад уладай Асманскай імперыі, Аўстрыі і Прусіі; ведаць ход нацыянальна-вызваленчай барацьбы славянскіх народаў на працягу XIX — пачатку XX ст. і як вынік — стварэнне незалежных славянскіх дзяржаў.

**Мэты асобаснага развіцця:** праз вырашэнне праблемнай сітуацыі, правядзенне практычнай работы, працы з дадатковай інфармацыяй і дакументамі развіваць разумовыя і аналітычныя здольнасці; спрыяць выхаванню ў вучняў пачуцця патрыятызму, цікавасці да гісторыі славянскіх народаў, павагі да асоб, якія змагаліся за шчасце і свабоду свайго народа.

**Тып урока:** урок засваення новых ведаў.

**Забеспячэнне ўрока:** Сусветная гісторыя Новага часу, XIX — пачатак XX ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. агульн. устаноў з бел. мовай навучання / пад рэд. У.С.Кошалева. Мн., 2010; Кошелев В.С., Темушев В.Н. Всемирная история нового времени XIX— начала XX в. Атлас. 9 класс. Мн., 2010; Кошелев В.С., Темушев В.Н. Контурные карты. Всемирная история Нового времени XIX—начала XX в. 9 класс. Мн., 2010; карта "Европа с 1870 по 1914 г.".

**План урока**

I. Арганізацыйны этап.
II. Актуалізацыя раней атрыманых ведаў.
III. Вывучэнне новага матэрыялу:
1. Культурнае адраджэнне.
2. Паўднёвыя славяне.
3. Заходнія славяне.
IV. Замацаванне вывучанага матэрыялу.
V. Рэфлексія.
VII. Дамашняе заданне.



***МІШЫНА Рыта Іванаўна.***
*Настаўніца гісторыі Забродскай сярэдняй школы Шклоўскага раёна. Нарадзілася ў г. Шчучын Гродзенскай вобл. У 1987 г. закончыла гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.Куляшова. З 1988 г. працуе ў Забродскай сярэдняй школе Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.*

glsdapamoga.bspu.by

## Ход урока

### I. Арганізацыйны этап.

Настаўнік спрыяе ўсталяванню эмацыянальна-пазітыўнага настрою вучняў. Жадае сумеснай плённай працы.

### II. Актуалізацыя раней атрыманых ведаў.

Настаўнік размяшчае на дошцы схему "Славяне" і прапануе вучням успомніць, якія групы славян адносяцца да заходніх, паўднёвых, усходніх славян. *(У схему настаўнік запісвае групы славян.)* Настаўнік задае вучням пытанне: *Па якой асноўнай прыкмеце яны падзелены на заходніх, паўднёвых, усходніх славян?*

Пасля абмеркавання схемы "Славяне" настаўнік задае вучням пытанне: *Як падзелы Рэчы Паспалітай паўплывалі на лёс заходніх і ўсходніх славян?*

Настаўнік фармулюе праблемнае заданне, якое запісана на дошцы: *Чаму Балканскі паўвостраў у пачатку XX ст. называлі "парахаўніцай" Еўропы?*

### III. Вывучэнне новага матэрыялу.

#### 1. Культурнае адраджэнне.

*Настаўнік.* Большасць славянскіх народаў, акрамя рускіх, у пачатку XIX ст. не мелі сваёй дзяржаўнасці. Беларусы і большая частка ўкраінцаў знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі. Польскія землі былі падзелены паміж Германскай і Аўстрыйскай Імперыямі. Чэхі і славакі знаходзіліся пад уладай Аўстрыйскай Імперыі. Не было сваёй дзяржавы і ў паўднёвых славян. Балгары, сербы, харваты пакутавалі ад прыгнёту Асманскай Імперыі. *(Настаўнік свой расказ суправаджае дэманстрацыяй насценнай карты "Европа с 1870 по 1914 г." тэрыторыю пражывання, вучні сочаць у атласе па карце "Барацьба славянскіх народаў за нацыянальную незалежнасць у XIX — пачатку XX ст." на с. 22).*

XIX стагоддзе ў гісторыі славянскіх народаў было стагоддзем барацьбы за нацыянальную незалежнасць, перадумовай якой стала культурнае адраджэнне славянскіх народаў.

Вывучаючы пытанні культурнага адраджэння славянскіх народаў, вучні прадаўжаюць запаўняць табліцу "Развіццё сусветнай навукі і культуры ў XIX — пачатку XX ст." *(с. 72 вучэбнага дапаможніка).*

Настаўнік зачытвае вытрымкі з верша балгарскага паэта Х.Боцева "Прощанье" *(дадатак 1)* і задае вучням пытанне: *Якая асноўная ідэя гэтага твора?*

Пасля абмеркавання верша вучні слухаюць урывак з эцюда польскага кампазітара Ф.Шапэна "Рэвалюцыйны" і адказваюць на пытанне: *Якія пачуцці ў вас выклікала гэтая мелодыя?* Вучням прапануецца апераджальнае заданне "Ф.Шапэн — польскі кампазітар" *(дадатак 2)*. Падчас выступлення вучня дэманструецца партрэт Ф.Шапэна.

Заслухаўшы паведамленне, настаўнік задае вучням пытанне: *Што аб'ядноўвае гэтых гістарычных дзеячаў: Х.Боцаў, Г.Ракоўскі, Ф.Шапэн, Я.Колар, Б.Сметана, А.Міцкевіч, Т.Шаўчэнка? (Асноўнай тэмай іх твораў была любоў да Айчыны, роднай мовы і народных традыцый).*

#### 2. Паўднёвыя славяне.

Настаўнік прапануе вучням прачытаць матэрыял на с. 149 вучэбнага дапаможніка пра Сербію і раскрыць гісторыю барацьбы сербаў па плану:

**План**

1. Прычыны нацыянальна-вызваленчай барацьбы.
2. Асноўныя падзеі.
3. Вынік барацьбы.

Настаўнік расказвае аб нацыянальна-вызваленчай барацьбе балгарскага народа. Ён выкарыстоўвае ўрывак з пісьма балгарскага журналіста Т.Бурмава ад 15 мая 1876 г., якое было напісана адразу пасля паўстання ў Плоўдзіве, якое не было падтрымана насельніцтвам іншых акругоў і пацярпела паражэнне: *"Туркі, ... спалілі толькі ў адным Філіпаўскім санджаке (павеце) 118 сёлаў і вёсак... Толькі ў адным сяле Клісуры башыбузукі (узброенае ўрадам турэцкае насельніцтва) забілі 180 дзяцей, якія вучыліся ў школе.*

*Бачна, што такое збіванне няшчаснага насельніцтва адбываецца па загадзя абдуманаму плану султанаўскага ўрада, бо яно ўзброіла ўсё мусульманскае насельніцтва, не прымае ніякіх мер да абмежавання небывалага ў гісторыі буянства башыбузукаў, а наадварот, прыкрывае іх дзеянні рэгулярным войскам...*

*Схема*






gisdapamoga.bspu.by

*Калі патрэбна была дапамога Расіі для няшчасных балгараў, дык яна цяпер вельмі неабходна. Чалавекалюбства, гонар заступніцы і маці славян, інтарэсы славянства — усё заклікае да неадкладнай і энергічнай дапамогі".*

Пасля знаёмства з пісьмом вучням задаюцца пытанні: *Якія былі метады і тактыка турэцкага ўрада ў адносінах да балгарскага народа? Ахарактарызуйце іх. Якая была апошняя надзея для балгараў? Чаму менавіта рускі народ павінен прыйсці на дапамогу?*

*Настаўнік.* Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія, Расія, Францыя, Вялікабрытанія — актыўна ўмешваліся ва ўнутраныя справы балканскіх народаў. У ліпені 1878 г. у Берліне была склікана міжнародная канферэнцыя, на якой былі перагледжаны вынікі руска-турэцкай вайны.

Вучням на сталы раздаюцца карткі з артыкуламі Сан-Стэфанскага дагавора і Берлінскага трактата.

*Заданне.* Параўнайце артыкулы Сан-Стэфанскага дагавора (3 сакавіка 1878 г.) і Берлінскага трактата (13 ліпеня 1878 г.). Адкажыце на пытанне: *Які дагавор больш выгадны для балгараў? (Гл. табліцу.)*

*Настаўнік.* У апошняй трэці XIX ст. за ўплыў на Балканскім паўвостраве змагаліся Расія, Аўстра-Венгрыя і Вялікабрытанія. У 1912 г. быў створаны Балканскі саюз, куды ўвайшлі Сербія, Балгарыя, Чарнагорыя, Грэцыя. У1913 г. у Лондане падпісаны мірны дагавор, згодна з якім Турцыя страціла ўсе свае ўладанні ў Еўропе. Балканскі саюз распаўся.

Пасля расказа настаўніка вучні адказваюць на пытанне: *Чаму Балканскі паўвостраў у пачатку XX ст. называлі "парахаўніцай" Еўропы?*

### 3. Заходнія славяне.

Настаўнік коратка нагадвае палітычныя факты з гісторыі польскага народа пасля падзелу Рэчы Паспалітай. Пасля вучні самастойна чытаюць і абмяркоўваюць матэрыял рубрыкі "Раім абмеркаваць" *(с. 152—153 вучэбнага дапаможніка).* Потым вучням на сталы раздаюцца карткі з дакументам.

*Картка*

*Заданне.* Пракаменціруйце заяву старшыні Пангерманскага саюза Э.Хасэ ад 14 ліпеня 1906 г. Пералічыце знешнепалітычным фактары, якія маглі паўплываць на нацыянальнае вызваленне польскага народа.

*«З пункту гледжання міжнароднага права намаганне польскага народа да аднаўлення яго незалежнасці ў межах польскай мовы не можа быць прызнана.*

*Цяперашняе прававое становішча грунтуецца на рашэннях і дагаворах Венскага кангрэса. Для змянення гэтага становішча неабходна не толькі згода Прусіі, Расіі і Аўстрыі, але і згода іншых дзяржаў, якія ўдзельнічалі ў Венскім кангрэсе. На такую згоду разлічваць не прыпадае.*

*...Уклад польскай нацыі ў еўрапейскую цывілізацыю быў да цяперашняга часу настолькі нязначным, што знікненне польскай нацыі не створыць у еўрапейскай цывілізацыі ніякай брэшы.*

*Ператварэнне ўсёй польскамоўнай тэрыторыі ў самастойную дэмакратычную рэспубліку з раўнапраўем усіх жыхароў, незалежна ад іх нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасці, уяўляецца невыканальным».*

Ці згодны вы са сцвярджэннем "*Уклад польскай нацыі ў еўрапейскую цывілізацыю быў да сённяшняга часу настолькі нязначным.....*»? Абгрунтуйце сваю думку. *(Заслухоўваюцца адказы вучняў, настаўнік іх удакладняе.)*

*Настаўнік.* XIX — пачатак XX ст. для заходніх славян — перыяд актыўнай барацьбы за нацыянальную незалежнасць. Пасля падаўлення паўстання 1863 — 1864 гг. уся паўната ўлады ў Каралеўстве Польскім належала царскаму намесніку. Хутка Каралеўства Польскае было перайменавана ў Прывіслінскі край і ў такім выглядзе "руская Польшча" праіснавала да распаду Расійскай Імперыі ў 1917 г.

У 1867 г. была абвешчана аўтаномія Венгрыі. У кастрычніку 1918 г. пасля распаду Аўстра-Венгерскай Імперыі чэхі і славакі аб'явілі аб стварэнні адзінай незалежнай дзяржавы Чэхаславакіі.

*Табліца*

| Сан-Стэфанскі дагавор | Берлінскі трактат |
|---|---|
| Арт. II. Бліскучая Порта канчаткова прызнае незалежнасць княства Чарнагоры. | Арт. XXIX... Чарнагорыя не можа мець ні ваенных суднаў, ні ваеннага сцяга. ...Паліцэйскі нагляд, марскі і санітарны... уздоўж усяго чарнагорскага ўзбярэжжа будзе ажыццяўляць Аўстра-Венгрыя. |
| Арт. VI. Балгарыя ўтварае самакіравальнае княства з хрысціянскім урадам і земскім войскам, але плаціць даніну. | Арт. XIII. На поўдзень ад Балкан (Паўднёвая Балгарыя) утвараецца правінцыя, якая атрымлівае назву "Усходняя Румелія" і якая застаецца пад непасрэднай палітычнай і ваеннай уладай я. і. в. (яе імператарскай вялікасці) султана. |
| Арт. XIX (аб турэцкіх тэрыторыях, якія адыходзяць да Расіі). | Арт. LX. Даліна Алашкерта і горад Баязет, якія былі саступлены Расіі артыкулам XIX Сан-Стэфанскага дагавора, вяртаюцца Турцыі. |



gisdapamoga.bsu.by



Хрыста Боцеў.



Адам Міцкевіч.



Фрыдэрык Шапэн.



Ян Колар.



Георгі Ракоўскі.



Бедржых Сметана.



Тарас Шаўчэнка.

gisdapamoga.bspu.by

**IV. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

Замацаванне вывучанага матэрыялу адбываецца з выкарыстаннем наступных пытанняў: *Што паўплывала на прычыны вызваленчай барацьбы славянскіх народаў? Якія славянскія народы сталі незалежнымі? Якія славянскія народы стварылі свае дзяржавы ў пачатку XX ст.? Як Расійская Імперыя паўплывала на атрыманне незалежнасці балгарскага народа? Як Расійская Імперыя дзейнічала на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай? Ці было палепшана міжнароднае становішча балканскіх народаў у XIX—пачатку XX ст.?*

**V. Рэфлексія.**

Рэфлексія праводзіцца па прынцыпу тэхналогіі “Тэлеграма”. Кожнаму вучню прапануецца напісаць тэлеграму з дапамогай інструкцыі: *Пра што важнае вы даведаліся на ўроку? Чаму вы навучыліся? Што вам спадабалася? Што засталося незразумелым? Што трэба зрабіць, каб зразумець вучэбны матэрыял?* На наступным уроку настаўнік аналізуе адказы вучняў.

**VI. Дамашняе заданне.**

Прачытаць § 23, адказаць на пытанні ў канцы параграфа. Падрыхтавацца па матэрыялу “Абагульняючыя пытанні і заданні да раздзелаў II і III” *(с. 153—156)*.

*Дадатак 1*

Не плачь, моя мать, не сетуй,
что стал я, твой сын, гайдуком,
гайдуком стал, бунтарем я,
тебя несчастной оставил
свое оплакивать чадо!
Но ты проклинай, родная,
турецкую злую неволю,
что обрекла нас скитаться
на этой горькой чужбине
немилых, чужих, бездольных,
вдали от родных и близких.
Я знаю, что, сын твой милый, —
быть может, юным погибну
я завтра у переправы
над белым, тихим Дунаем.
Но что же, скажи мне, делать,
коль ты меня породила
с мятежным юнацким сердцем,
И сердце мое не терпит
Того, что турок глумится
Над очагом отцовским...

* * *

А если, родная, в селенье
приду я живой, невредимый,
со знаменем, поднятым гордо, —
под знаменем славы юнаки
в расшитой гайдуцкой одежде,
и львы на шапках сверкают,
все с ружьями за плечами,
и саблями-змеями сбоку...

* * *

Тогда ты, родимая, встретишь
и старшего сына, обнимешь,
обнимешь его, поцелуешь,
на светлом челе прочтешь ты
два слова: СМЕРТЬ ИЛЬ СВОБОДА...

* * *

В дорогу! Прощай же, родная!
В дорогу! Ты жди меня, люба!
Дружина в поход выступает
дорогою страшной, но славной.
Быть может, я юным погибну,
но... выше не будет награды,
коль скажут когда-нибудь люди:
он умер, бедняга, за правду,
за правду и за свободу.

*Дадатак 2*

**Ф.Шапэн — выдатны польскі кампазітар**

Фрыдэрык Шапэн нарадзіўся ў 1810 г. у прадмесці каля Варшавы. У 1826—1829 гг. атрымаў добрую музычную адукацыю ў Галоўнай школе музыкі ў Варшаве. Увосень 1830 г. Фрыдэрык Шапэн пачаў даваць канцэрты ў Вене і іншых гарадах. Аднак весткі з радзімы пра тое, што ў Варшаве пачалося нацыянальна-вызваленчае паўстанне, вымусіла яго вярнуцца. Ён ведаў, што сярод паўстанцаў могуць быць яго бацька і сябры. Аднак яны адгаварылі яго вяртацца на радзіму, і ён рушыў у Парыж. Вестка пра тое, што паўстанне жорстка падаўлена, шмат удзельнікаў паўстання былі сасланы ў Сібір, вельмі ўсхвалявала яго. Уражаны такімі падзеямі, ён напісаў эцюд “Рэвалюцыйны”. У ім адлюстраваны падзеі лістападаўскага паўстання 1830 г. у Варшаве, а таксама гнеў і смутак.

За сваё творчае жыццё Ф.Шапэн стварыў шмат розных па жанры музычных твораў. Усе яны прасякнуты народнымі польскімі матывамі, духам патрыятызму. Ён наказаў, каб пасля смерці яго сэрца забальзамавалі і пахавалі ў Варшаве.

У гонар Ф.Шапэна названы кратэр на Меркурыі. У Варшаве штогод праводзіцца міжнародны конкурс піяністаў яго імя.

gisdapamoga.bspu.by